# Царква Раства Багародзіцы ў Слаўгарадзе і яе размалёўкі

Слаўгарадская царква Раства Багародзіцы ў плане цэнтрычная, пабудаваная на аснове грэчаскага крыжа. Цэнтральны аб'ём выдзелены крыжовымі слупамі, на якія абапіраецца квадратны барабан са зрэзанымі вугламі, завершаны купалам і асветлены праз вялікія паўцыркульныя вокны-люнеты ў чатырох гранях. Паміж канцамі крыжа прыбудаваны нізкія чвэрцькругавыя аб'ёмы, перакрытыя адпаведнымі сектарамі купальнага (конхавага) скляпення. Архітэктурная кампазіцыя храма цалкам сіметрычная, чатыры фасады выярашаны аднолькава, завершаны класіцыстычнымі антаблементамі і невысокімі франтонамі. Унутры царквы плечы крыжа перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі, у купале — паўсферычнымі. Насупраць увахода па восі храма амаль на краі абрыву пастаўлена двух'ярусная званіца. Вуглы ніжняга яруса скругленыя, над уваходнымі парталамі прарэзаны паўцыркульныя вокны-люнеты, ярус па краях аздоблены невысокімі вежачкамі. Другі ярус, прызначаны для званоў, прарэзаны вузкімі праёмамі, у завяршэнні званіцы — невялікая вежачка.

Слаўгарадская царква са званіцай — адзін з самых дасканалых узораў архітэктуры класіцызму ў Беларусі. Пытанне аб яго стваральніках даўно хвалявала даследчыкаў. В.Ф.Марозаў выказаў меркаванне, што праект царквы і званіцы належыць рускаму архітэктару М.Львову на падставе характэрнага для яго вырашэння пабудовы. Многія цэрквы, пабудаваныя Львовым, маюць рысы падабенства са слаўгарадскай. Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца царква ў Арпачове Наваторжскага павета, якую завяршае падобны на слаўгарадскі квадратны купал са скошанымі вугламі і паўцыркульнымі вокнамі, а паўцыркульныя прыдзелы нагадваюць нізкія прыбудовы паміж канцамі крыжа. Асноўны аб'ём арпачоўскай царквы, пабудаванай у 1783 г., мае кубічную форму, да яго прыбудаваны класіцыстычныя порцікі, план слаўгарадскай больш развіты і прапарцыянальны. Такі ж купал узвышаецца над манументальным Барысаглебскім саборам у Таржку (1785). У праекце Калыванскай царквы (1780-я гады) і Слаўгарадскай царкве адзначаюцца аднолькавыя праёмы з люнетамі і калонамі. Царква ў Прамухіне нагадвае слаўгарадскую крыжовым планам і завяршэннем сяродкрыжжа квадратным барабанам(без скосаў вуглоў) з «львоўскімі» трохчасткавымі вокнамі-люнетамі.

У канцы XVIII (ці, больш верагодна, у пачатку XIX ст.) царква размалявана невядомымі мастакамі ў стылі ранняга класіцызму. Выказвалася гіпотэза аб аўтарстве вядомага рускага мастака У.Л.Баравікоўскага, аднак без стылістычных параўнанняў, а пераважна з-за таго, што ён у гэты час маляваў абразы для іканастаса Магілёўскага Іосіфаўскага сабора. Росписы вызначаюцца высокім майстэрствам кампазіцыі, малюнка і каларыту, а таксама незвычайна шырокай іканаграфічнай праграмай з 57 сюжэтаў на евангельскія тэмы.

На скляпенні купала знаходзіцца разгорнутая кампазіцыя «Цябе Бога хвалім» (паказана Новазапаветная Тройца ў атачэнні шматлікіх анёльскіх хораў). На скосах вуглоў барабана ў верхнім ярусе ўпоравень з вокнамі-люнетамі прадстаўлены чатыры евангелісты, якія сядзяць на воблаках. Пад імі, у ніжнім ярусе барабана, знаходзяцца пары апосталаў: Пётр і Сымон, Якаў і Павел, Філіп і Фама ў характэрным для барока размяшчэнні па дыяганалі і дынамічных лятучых позах.

На плоскасцях сцен пад паўцыркульнымі вокнамі размешчаны «Зыходжанне благадаці на дзіця-Ісуса», «Хрыстос і дзеці», «Уваскрэсенне», «Разасланне апосталаў». Былі размалёўкі і на конхавых скляпеннях: «Пакланенне Спрадвечнаму» і «Не мір, але меч».

У паўночным прыдзеле два сюжэты на плоскасцях слупоў і два насупраць на бакавой сцяне маюць алегарычны змест (Дастатак, Працавітасць і г.д.). Такім жа чынам у паўднёвым прыдзеле размешчаны алегарычныя выявы Веры, Надзеі, Любові і Соф'і.

На бакавых сценах над аркамі, што злучаюць апорныя слупы з пілястрамі на бакавых сценах, намаляваны сцэны з жыцця Хрыста: з паўночнага боку — «Ісус і невядомы персанаж», «Ісус нясе

крыж»; з паўднёвага — «Уваскрэсенне Лазара» і страчаны невядомы сюжэт. Размалёўкі знаходзяцца і на паўцыркульных скляпеннях: ад заходняга ўвахода — «Усёвідушчае Вока», з поўначы — «Ойча наш», з поўдня — «Малітва да Багародзіцы».

Ніжні ярус размалёвак складаецца з сюжэтаў, якія належаць да двух тэматычных цыклаў. На заходнім плячы крыжа размешчаны ілюстрацыі «Евангельскіх прытчаў», і ў папярочных крылах — »Пакутны шлях Хрыста». Пачынаючы ад уваходу па ходу сонца паказаны «Прытча пра добрага самараніна», «Прытча пра добрага пастуха», «Прытча пра сучок у воку». Адпаведна справа супраць ходу сонца — «Прытча аб даўжніку», «Грэшнік у геене вогненнай». У паўночным крыле на сцяне і слупах насупраць — «Здзекі над Хрыстом (Скажы, хто цябе ўдарыў)», «Пацалунак Іуды», «Арышт Хрыста».

У паўднёвым крыле знаходзяцца «Хрыстос перад Каіяфам», «Лжэсведчанне супраць Хрыста», «Апрананне баграніцы», «Збіванне Хрыста ў прэторыі». У падкупальнай прасторы на паўцыркульнай арцы паміж крыжападобнымі пілонамі, насупраць алтара, — дзве вялікія фрэскі: «Ахвярапрынашэнне Аўраама» і «Пір у Сымона-фарысея». На тарцах заходніх пілонаў, якія ўтвараюць праход у падкупальную прастору, намаляваны «Вялікапакутнік Дзімітрый» і «Дзімітрый Растоўскі». Насупраць іх, на тарцах пары ўсходніх пілонаў, - дзве цалкам страчаныя фрэскі.

Стан размалёвак ужо ў сярэдзіне 1970-х гадоў, калі яны былі ўпершыню даследаваны і сфатаграфаваны экспедыцыяй Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі (ІМЭФ НАН Беларусі), быў жахлівы. За многія гады выкарыстання храма як гандлёвага склада фрэскі пакрыліся разнастайным пылам. Аднак іх разбурэнне катастрафічна паскорылася пасля таго, як храм быў абвешчаны помнікам архітэктуры і ўзяты пад ахову дзяржаўных органаў культуры. Склад з царквы вывелі, але адначасова перасталі рамантаваць дах. У 1972 г. пачалі «рэстаўрацыю», аднак грошай хапіла толькі на тое, каб паставіць знадворку і ўнутры рыштаванні. Па іх у пакінуты без нагляду храм да размалёвак дабраліся мясцовыя хуліганы рознага ўзросту. Час быў такі, што змаганне з «рэлігійным дурманам» заахвочвалася нават у школе. На фрэсках пачалі выбіваць вочы і насы, з'явіліся непрыстойныя надпісы. Найбольшую шкоду нанесла вада, якая пранікала праз дзіравы дах: пачалося засаленне роспісаў, а затым і асыпанне іх разам з тынкам на скляпеннях. У канцы 1970 — пачатку 1980-х гадоў аддзел старажытнабеларускай культуры ІМЭФ АН Беларусі дакладваў аб катастрафічным стане слаўгарадскіх фрэсак у самыя высокія ўрадавыя і партыйныя ўстановы БССР, але безвынікова. Роспісы працягвалі гінуць да 1991 г., калі храм быў аддадзены вернікам. Пасля гэтага дах адрамантавалі, аднак рэшткі ацалелых фрэсак у пераважнай большасці забялілі. Таму прыведзенае ніжэй апісанне заснавана на матэрыялах даследаванняў і фотафіксацыі ў канцы 1970-х гадоў, якія захоўваюцца ў архіве Аддзела старажытнабеларускай культуры ІМЭФ Нацыянальнай АН Беларусі.

Першае, што кідаецца ў вочы, — амаль поўная адсутнасць сюжэтаў са Старога Запавету. Выключэнне складае толькі «Ахвярапрынашэнне Ісаака Аўраамам», якое, дзякуючы месцу размяшчэння, складаным чынам пераклікаецца з «Пірам у Сымона-фарысея». Алегарычны сэнс апошняга сюжэта заключаецца ў выратаванні грэшнага чалавека праз шчырую, а не паказную веру ў Хрыста, пераклікаецца з ідэяй выратавання «сыноў Аўраамавых» праз ягоную веру ў Спрадвечнага Бога. У цэлым жа сістэма слаўгарадскіх размалёвак як бы з'яўляецца ілюстрацыяй да Божага ўвасаблення ў чалавеку. Трохадзіны Бог тут выступае то ў вобразе Саваофа з трохкутным німбам, то ў вобразе Хрыста, нават у сцэнах умоўных, не звязаных з падзеямі евангельскай гісторыі.

Сэнсава размалёўка пачынаецца з манументальнай кампазіцыі «Цябе Бога хвалім», пра што сведчыць тэкст адпаведнай малітвы, размешчаны ў месцы злучэння скляпення купала і барабана. Жоўта-залацістае ззянне ў цэнтры скляпення паступова пераходзіць у кола херувімаў, серафімаў, архангелаў і анёлаў, якія спяваюць і граюць на разнастайных музыч-

ных інструментах. На гэтым фоне з усходняга боку вылучаецца постаць сівабародага старца са скрыжаллю (ці кнігай?) і скіпетрам, які сядзіць на вялізнай блакітнай сферы. Насупраць яго два крылатыя юнакі — архангелы Гаўрыіл і Міхаіл, апранутыя ў рудавата-чырвоныя плашчы. Складаная структура кампазіцыі з пераходам ад сімвалаў да матэрыяльных постацей анёлаў нагадвае тэорыю пазнання Бога Псеўда-Дыянісія Арэапагіта, а надзвычайны дынамізм заснаваны на прынцыпах мастацтва барока.

Барокавыя рысы адчуваюцца і ў жывапісе чатырох евангелістаў на прасценках барабана. Іх выявы размешчаны ў ілюзорных рамах на фоне блакітнага неба, яны плывуць на аблоках і плашчы іх быццам падхоплены паветранымі струменямі.

Але чым ніжэй знаходзіцца фрэска, тым болей у яе кампазіцыі барокавы рух супакойваецца і выяўляюцца рысы класіцызму, асабліва выразныя ў цыкле пакут Хрыста. Пачынаецца ён з «Пацалунка Іуды» і закончаны «Хрыстом, які нясе крыж». Паміж імі — «Арышт», чатыры сцэны з удзелам першасвятароў, «Апрананне баграніцы» і «Збіванне Хрыста ў прэторыі». Здрада, спакусы, выпрабаванне, пачатак крыжовага шляху — мастак быццам спагадліва ўглядаецца ў чалавечую прыроду Хрыста, яго паводзіны ў пераломны момант, калі яшчэ ёсць магчымасць, каб «абмінула мяне чаша гэтая», і стварае гімн мужнасці і стойкасці. Асабліва дасканала ў мастацкіх адносінах намалявана сцэна здрады Іуды. У сініх начных прыцемках Хрыстос абкружаны жаўнерамі. Да яго грудзей прынік Іуда, твар яго не бачны. Над натоўпам лес дзід. Святло з узнятай паходні вырывае з цемры твар Хрыста, блішчыць на блакітна-металёвых касках.

Шэсць сцэн разгортваюцца ў памяшканні на фоне магутных калон і арак. На ўзвышшы пад вэлюмам-занавесам — першасвятар. Праз вялікія арачныя праёмы льецца святло золаку. Стомлены Хрыстос абкружаны габрэямі і жаўнерамі. Каіяфа, выкінуўшы наперад руку, абвінавачвае яго. Вось на змучанага Хрыста, які апусціў галаву, апранаюць баграніцу. Усе гэтыя сцэны размешчаны ў першым ярусе і лёгкадаступны для агляду. Апошняя сцэна з нясеннем крыжа перанесена ў люнет паўночнага прыдзела, скляпенне якога занята размалёўкай-ілюстрацыяй да малітвы «Ойча наш». Гэта кампазіцыя, як і размалёўка, прысвечаная малітве да Багародзіцы, вельмі ўмоўная. На фоне празрыста-хмарнага неба плаваюць постаці анёлаў, Саваофа, Богамаці; развіваюцца белыя стужкі з тэкстамі малітваў. Фарбы пастозныя, постаці раствараюцца ў паветры, хоць рухі выразна акрэслены.

Надзвычай цікавымі з'яўляюцца размалёўкі на каляалтарных конхах. У цэнтры «Пакланення спрадвечнаму» на мармуровым пастаменце ў аблоках сядзіць Хрыстос. Бела-жоўтае ззянне ад яго прарэзана белымі праменямі. Вакол яго і ніжэй — паўвяночкам шэрагі ўкленчаных барадатых старцаў у малітоўных позах, апранутых у падпярэзаныя армякі. У руках некаторых кнігі, Хрыстос трымае двума пальцамі скіпетр. Зусім незвычайная і цяжкая для прачытання кампазіцыя «Не мір, але меч», ад якой былі відаць толькі рэшткі. У ніжняй частцы бачны постаці і разгубленыя твары людзей. Жывапіс тут больш корпусны, чырвоныя, сінія, рудыя, зялёныя фарбы — насычаныя.

Найменш маляўнічыя, амаль грызайлевыя сцэны ілюструюць прыпавесці («Прытчы»). Найбольш выдатная з іх у каларыстычных адносінах сцэна, якую можна ўмоўна назваць «Грэшнік у геене вогненнай» (ці «Астудзі мяне...»). Уключэнне ў сістэму размалёвак выяў крылатых жанчын-алегорый дае магчымасць зразумець, якой складанай іншасказальнай мовай карыстаўся стваральнік ці ўкладальнік праграмы гэтых манументальных размалёвак. Вельмі многа новага можна было б даведацца аб духоўным жыцці Беларусі на мяжы XVIII — XIX ст., калі б удалося да канца расшыфраваць гэту праграму.

У самым агульным плане можна сказаць, што слаўгарадскія размалёўкі выкананы ў духу ранняга класіцызму, дзе адчуваецца яшчэ багата рэмінісцэнцый асветніцтва і нават барока. Мастак выдатна валодае малюнкам, мадэліроўка аб'ёмаў пераважна святлоценявая. Каларыт будуецца на спалучэнні чыстых адкрытых фарбаў, што надае яму святочны харак-

тар. Але ў больш абстрактных кампазіцыях мастак шырока выкарыстоўвае пастозны мазок пэндзля. У яго стылі адчуваецца сувязь з кіеўскай мастацкай школай таго часу.

Пытанне аб часе выканання і мастаку слаўгарадскіх размалёвак непасрэдна звязана з выяўленнем іх заказчыка. Сярод евангельскіх сюжэтаў тут нечакана з'яўляюцца выявы св. Дзімітрыя Вялікапакутніка і мітрапаліта Дзімітрыя Растоўскага (1651—1709), вядомага рэлігійна-культурнага дзеяча ўкраінскага паходжання, звязанага і з Беларуссю. Ён праславіўся ўкладаннем шматтомных Жыцій святых (Чэцці-Мінеі), якімі праваслаўная царква карыстаецца і цяпер. Святы адлюстраваны ў рост, у архірэйскім адзенні, з посахам у правай руцэ, левая пакладзена на раскрытую кнігу на стале. Полка з радамі тоўстых кніг у скураных пераплётах на заднім плане нагадвае аб працы над згаданымі вышэй Чэццямі-Мінеямі. Відавочна, выявы ажно двух святых Дзімітрыяў маюць патранальны сэнс. Найперш, яны могуць быць звязаны з асобай Дзмітрыя Міхайлавіча Галіцына (1721—1793), стрыечнага брата фундатара Слаўгарадскай царквы Аляксандра Міхайлавіча Галіцына. Гэта вядомы дзяржаўны дзеяч і дыпламат, пасол у Парыжы і Вене, ён падрыхтаваў сустрэчу аўстрыйскага імператара Іосіфа з Кацярынай II у Магілёве. Праславіўся і як мецэнат мастакоў і вучоных, завяшчаў вялікія грошы на пабудову Галіцынскай бальніцы ў Маскве, у царкве якой быў пахаваны Аляксандр Міхайлавіч Галіцын.

Аднак такой заманлівай гіпотэзе пярэчыць герб сярод размалёвак, які не належыць Галіцыным. Таму, пакідаючы вырашэнне гэтай праблемы на будучае, варта з жалем адзначыць, што выдатнейшы помнік выяўленчага мастацтва Беларусі мяжы XVIII—XIX ст. фактычна загінуў у наш час. Гэта з'яўляецца вялікай стратай для беларускай культуры, таму што размалёўкі царквы Раства Багародзіцы былі апошнім комплексам манументальнага жывапісу такой мастацкай вартасці. Да таго ж яны не пашкоджаны так званымі «панаўленнямі», разгорнутая іх праграма і стыль жывапісу не маюць сабе роўных сярод ацалелых помнікаў Беларусі.

*Ю.Хадыка, А.Ярашэвіч.*

## Экспанаты Слаўгарадчыны, знікшыя з музеяў

Даваенныя наведвальнікі Магілёўскага краязнаўчага музея памятаюць, што ў яго залах экспанаваліся троннае крэсла імператрыцы Кацярыны II і вялікі драўляны карэц часоў Аляксея Міхайлавіча. А ў Мінску, у Дзяржаўным гістарычным музеі, захоўвалася медная дошчачка, якая сведчыла аб тым, што ў Прапойску ў князя Галіцына гасцявала царыца. Гэтыя экспанаты трапілі ў музеі са Слаўгарадчыны, але зараз, на вялікі жаль, у музейных экспазіцыях іх няма.

Звесткі пра першыя два экспанаты змешчаны ў «Описании Могилевского музея», складзеным М.В.Фурсавым і выдадзеным у Магілёве ў 1898 г. У гістарычным аддзеле гэтага апісання значыцца:

«1. Тронное кресло Императрицы Екатерины II. Стиль кресла рококо. Оно вызолочено по дереву, обито парчою из чистой серебряной нити с шелковыми затканными в нее цветами по темно-серому фону. На сиденье и по обе стороны спинки вытканы государственный герб и вензель Императрицы на груди орла. Обивка прикреплена к остову кресла золочеными кнопками.

Кресло доставлено г. начальнику губернии от причта Пропойской православной церкви при легенде, что оно подарено Императрицею церкви во время проезда ее через Пропойск на отдых в Крым. Легенда эта, однако, не имеет никакой исторической подкладки; скорее должно предположить, что кресло ранее находилось в апартаментах Могилевского путевого дворца (тогда как оно попало в Пропойск). В записках Добрынина упоминается о тронном зале в доме Белорусского наместника. Оно могло стоять там...

7. Деревянный ковш времен царя Алексея Михайловича, выдолбленный с ручкою из одного куска дерева и расписанный внутри и снаружи масляными красками. Вместимость ковша ведро и